ставки на аукционе доменов. По окончанию этих 30 дней любой пользователь может приобрести домен.

Первые 10 лет (до 1995 года) регистрация доменов была совершенно бесплатной. В 1995 (после введения платы за домены) цена составляла 100 долларов за регистрацию имени, затем наметилась быстрая тенденция к снижению этой цифры и теперь домены на просторах интернета можно найти от 2 долларов.

Доменные имена в настоящее время являются одним из стремительно развивающихся видов интеллектуальной собственности. Короткое и запоминающееся доменное имя способствует росту числа посетителей сайта, а трудное в написании или не внушающее доверия имя отпугивает потенциальных посетителей. Поэтому к выбору имени при создании сайта следует отнестись серьезно.

## Список использованных источников


1. Фролов А. В., Фролов Г. В. Глобальные сети компьютеров. практическое введение в Internet, E-Mail, FTP, WWW и HTML. М ./ А. В. Фролов – Диалог-МИФИ – 2006.

2. Как выбрать домен для сайта [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.nic.ru/info/blog/how-to-choose-domain/. Дата обращения: 17.03.2022.


УДК 811.161.3

## Вывучэнне беларускай мовы (прафесійная лексіка) пры падрыхтоўцы педагогаў-інжынераў


**Доўгі С. А., студэнт**

*Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт*

*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік: старэйшы выкладчык Мурманцава Т. М.*



Анатацыя:

Разглядваецца неабходнасць вывучэння «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» при падрыхтоўцы педагогаў-інжынераў. Прыведзены асноўныя меты выкладання дысцыпліны, якія

дапамагаюць сфарміраваць камунікацыйную развітую асобу, здольную наладжваць зносіны на роднай мове у прафесійнай сфере.

Мова – унікальнейшая з'ява. Яна адначасова з'ява ідэальная і матэрыяльная, індівідуальная і сацыяльная, самая старажытная і самая свежая, яна адначасова і адрознівае чалавека ад усяго свету жывых істот, і аб'ядноўвае вялікі клас жывых істот у адзін чалавечы род. Курс «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» для студэнтаў інжынерна-педагагічнага факультэта складзены ў адпаведнасці з праграмай дысцыпліны, зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Ен уключае наступныя раздзелы:

– уводзіны ў навуку аб мове;

– з гісторыі пісьма;

– паходжанне і развіцце беларускай мовы (раздзел змяшчае таксама тры дадаткі);

– функцыянальныя стылі сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– стылістыка афіцыйна-дзелавых дакументаў.

Працягласць вучэбнай дысцыпліны на 3 курсе (ў 6-м семестры) у адпаведнасці з вучэбным планам складае 34 каляндарныя гадзіны. Па выніках вывучэння курса «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» для студэнтаў спецыяльнасці «Прафесійнае навучанне і педагогіка» (па напрамках) прадугледжвае атэстацыю ў выглядзе заліку. Па завяршэнні курса будучы педагог-інжынер павінен валодаць базавымі навыкамі камунікацыі ў вуснай або пісьмовай форме для вырашэння прафесійных задач, а таксама міжасобаснага і міжкуль-турнага ўзаемадзеяння. Навучанне прафесійнаму маўленню будучага педагога-інжынера мэтазгодна пачынаць з тэксту па напрамках, у нашым выпадку, гэта машынабудаванне. Праца над ім пачынаецца са слоў-тэрмінаў, бо без ведання тэрміналагічнай лексікі нельга зразумець асноўныя месцы тэксту, вызначыць ключавыя словы для далейшай яго перадачы ў выглядзе рэферата. Студэнты інжынерна-педагагічнага факультэта павіны самастойна навучыцца складаць навуковыя тэксты – даклады, курсавыя і дыпломныя работы, бо ім гэта ў далейшым спатрэбіцца ў працы выкладчыка, малодшага навуковага супрацоўніка, а таксама майстра вытворчага навучання ва ўстанове адукацыі. Студэнты абавязаны не проста навучыцца перакладаць тэхнічны або навуковы матэрыял, узяты з падручніка,

але і аналізаваць яго, перабудоўваць, лагічна размяшчаць па спецыяльнасці. Таксама ў тэксце неабходна правільна ўводзіць асобныя паняцці, цытаты, схемы, табліцы, прыклады і г. д. Гэта дапаможа будучаму педагогу-інжынеру актывізаваць яго тэрміналагічны запас, зрабіць кампрэсію тэксту, вызначыць яго асноўную думку і сцісла перадаць змест. Як паказала практыка, навучальны працэс у ВНУ з педагагічным факультэтам часта арганізаваны ў форме калектыўнага навучання, якое суправаджаецца перадачай вуснай інфармацыі ад выкладчыка да студэнтаў, якія з’яўляюцца часцей за ўсе слухачамі. У працэсе навучання педагог павінен стварыць такі мікраклімат у калектыве, у якім студэнты адчувалі б сябе свабодна, не баяліся праяўляць ініцыятыву, адчувалі справядлівае і добразычлівае стаўленне да сябе. Калі не заглушаецца ініцыятыва ў будучых педагогаў-інжынераў, то ў іх фарміруецца ўпэўненасць у сваіх сілах і магчымасцях, развіваецца захапленне, стымулюецца самастойнасць, асабістая актыўнасць, імкненне для самаўдасканалення дзейнасці, неабходны і дастатковы ўзровень агульнай і спецыяльнай тэарэтычнай падрыхтоўкі спецыялістаў.

Праграма дысцыпліны пры падрыхтоўцы на інжынерна-педагагічным факультэце прадугледжвае набыцце навыкаў рацыянальных і эфектыўных моўных паводзін у разнастайных сітуацыях прафесійных і дзелавых зносін, эфектыўнага карыстання моўнымі сродкамі беларускай мовы ў практычнай дзейнасці. Такім чынам, вывучэнне курса Беларуская мова (прафесійная лексіка) са студэнтамі інжынерна-педагагічнага факультэта з'яўляецца неад'емным элементам фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці спецыялістаў і асновай для набыцця маўленчага вопыту ў розных сферах зносін.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Беларуская мова (прафесійная лексіка). У 4 ч. Ч. 1. Беларуская мова: агульныя звесткі, паходжанне і развіцце, функцыянальныя стылі : вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў БНТУ / Л. А. Гіруцкая [і інш.] ; пад рэд. Л. А. Гіруцкай. – Мінск : БНТУ, 2005. – 289 с.